Аналіз фактычных дадзеных аб правядзенні мерапрыемстваў, якія можна расцэньваць як праявы культурнай дыпламатыі, дазваляе зрабіць наступныя высновы аб яе актуальным стане ў Рэспубліцы Беларусь: 1) культурныя акцыі найбольш актыўна ажыццяўляюцца ў суседніх, памежных краінах (пераважна на постсавецкай прасторы); 2) у краінах, якія не ўваходзяць у СНД (асабліва ў Польшчы), культурныя акцыі ў вялікай ступені арыентаваны на беларускую дыяспару. Абедзве высновы сведчаць не на карысць беларускай культурнай дыпламатыі. На прасторы СНД імідж нашай краіны ў высокай ступені станоўчы, так што нейкая асобная актыўнасць у гэтым кірунку не патрэбна.

Так ці інакш, у Беларусі ў апошнія гады пачалося стварэнне адмысловых органаў культурнай дыпламатыі. У ліпені 2008 г. у Беластоку пры беларускай амбасадзе ў Польшчы быў адкрыты Культурны цэнтр Беларусі. За апошні год ён прыняў удзел у арганізацыі шэрагу мерапрыемстваў у Польшчы, прапагандуючы беларускую культуру. Але ва ўсіх гэтых мерапрыемствах асноўную ролю адыгрывала Беларускае грамадска-культурнае таварыства, а самі падзеі зноў-такі былі ў вялікай ступені засяроджаны на беларускай дыяспары ў Польшчы. Аналагічныя Культурныя цэнтры планавалася адкрыць і ў іншых краінах — Літве, Расіі, Украіне, Ізраілі, нават у Аўстраліі. Праўда, гэтае пажаданне ўсё яшчэ чакае сваёй рэалізацыі.

У якім жа кірунку будзе развівацца беларуская культурная дыпламатыя? Якія будуць яе асаблівасці? На сённяшні дзень мы можам адзначыць наступныя ключавыя моманты.

1. У арганізацыі беларускай культурнай дыпламатыі вялікую, калі не вядучую ролю адыграе Міністэрства культуры. Прызначэнне на пасаду міністра былога амбасадора Беларусі ў Польшчы П. Латушкі часам разглядаецца як хіба што не паваротны момант у станаўленні беларускай культурнай дыпламатыі. Дарэчы, Культурны цэнтр Беларусі ў Польшчы таксама ў пэўнай ступені з’яўляецца яго тварэннем. Менавіта з Міністэрства культуры ў апошнія часы гучаць смелыя прапановы па актывізацыі культурнай дыпламатыі.

2. Асноўным інструментам беларускай культурнай дыпламатыі стануць Культурныя цэнтры, якія выступяць своеасаблівымі аналагамі Польскіх інстытутаў. Можна меркаваць, што ў агляднай будучыні такі цэнтр паўстане ў Кіеве (Украіна). У далейшым найбольш мэтазгодна будзе заснаванне такіх цэнтраў у Літве (Вільнюс) і Латвіі (Рыга).

3. Пры распрацоўцы канцэпцыі беларускай культурнай дыпламатыі мэтазгодна абаперціся на знакавыя культурныя і гістарычныя падзеі, на вобразы славутых дзеячаў мінулага, постаці якіх яднаюць беларускі народ з іншымі. Тут варта звярнуцца да спадчыны ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Патрэбна памятаць, што ў наступным годзе святкуюцца два юбілеі, якія як раз можна скарыстаць для актывізацыі беларускай культурнай дыпламатыі, — 600-годдзе Грунвальдскай бітвы і 625-годдзе Крэўскай уніі.

Такім чынам, беларуская культурная дыпламатыя мае значны патэнцыял для развіцця. Выкарыстанне гэтага патэнцыялу дазволіць Беларусі палепшыць свой імідж на міжнароднай арэне, а таксама атрымаць пэўныя перавагі ў эканамічным і палітычным супрацоўніцтве.

## АБ ГІСТАРЫЧНА-КУЛЬТУРНЫХ ВЫТОКАХ І НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЯХ ДЗЯРЖАЎНАГА ПРАТАКОЛА

***Міхалькевіч Г. Н.,*** *Беларускі дзяржаўны універсітэт*

Сёлета (30 верасня) адзначыла 15 гадоў з дня стварэння Служба дзяржаўнага пратакола МЗС Рэспублікі Беларусь, на якую Указам Прэзідэнта краіны ўскладзена адказнасць за забеспячэнне адзінага дзяржаўнага пратакола. Намаганнямі

перш за ўсё менавіта гэтай структуры напрацаваны пэўны пратакольны досвед суверэннай беларускай дзяржавы. Падаецца цікавым прааналізаваць згаданы досвед у кантэксце яго адпаведнасці міжнароднапрызнаным звычаям і нацыянальным традыцыям.

Пратакол, як вядома, — катэгорыя гістарычная. Людзі спрадвеку з вялікай колькасці абрадаў, рытуалаў, узораў паводзін адбіралі тыя, якія ў найбольшай ступені спрыялі міралюбнасці, дабразычлівасці зносін. З узнікненнем дзяржаў з'явілася неабходнасць упарадкавання публічнай дзейнасці дзяржаўных інстытутаў і міждзяржаўных зносін на аснове добрасуседства. Гэтыя функцыі і выконвае пратакол, які ў прымяненні да практыкі канкрэтнай дзяржавы вызначаюць паняццем «дзяржаўны пратакол».

На першы погляд, прыметнік «дзяржаўны» тут падаецца не зусім карэктным, паколькі размова вядзецца аб агульнапрызнаных міжнародных правілах зносін. На самай справе пратакол — гэта заўседы сінтэз інтэрнацыянальнага і нацыянальнага, уніфікаванага і самабытнага. Публічная дэманстрацыя дзяржавай праз пратакол беражлівага стаўлення да сваіх гістарычных каранёў, культурнай спадчыны, яе арганічнае спалучэнне з сучаснай працэдурай знешніх зносін на карысць міжнароднай пратакольнай практыцы. Пры гэтым арыгінальная мадэль нацыянальнага пратакола — адзін з дзейсных сродкаў фарміравання іміджу маладой дзяржавы, яе самаідэнтыфікацыі ў сусвеце.

Аналіз зместу афіцыйных мерапрыемстваў, якія забяспечвае Дзяржпратакол МЗС, дае падставы для высновы аб іх адпаведнасці агульнапрынятым міжнародным крытэрыям. Сведчанне таму — сцэнарыі цырымоніі інаўгурацыі Прэзідэнта краіны, уручэння яму даверчых грамат замежнымі пасламі, мерапрыемстваў у рамках візітаў у Беларусь замежных дэлегацый на вышэйшым і высокім узроўні і інш. Іх змест суадносіцца з базавымі прынцыпамі міжнароднай ветлівасці — праяўленне павагі да партнёра, пачціваcці да яго дзяржаўных сімвалаў, прызнанне суверэннай роўнасці прадстаўнікоў розных краін, недыскрымінацыя, узаемнасць і г. д.

Што тычыцца нацыянальнай самабытнасці і прывабнасці беларускай пратакольнай практыкі, то магчымасці для яе ўдасканалення бачацца недаацэненымі. Рэспубліка Беларусь заслугоўвае пазіцыяніравання як еўрапейская краіна з глыбокімі гістарычнымі традыцыямі дзяржаўнасці, знешняй палітыкі. У сцэнарыях жа афіцыйных пратакольных мерапрыемстваў усіх узроўняў дэманстрацыі такой гістарычнай пераемнасці яўна бракуе. За апошняе дзесяцігоддзе на Беларусі аднаўлены і адрэстаўрыраваны знакавыя для нацыянальнай культуры помнікі дойлідства. Аднак іх патэнцыял ў пратаколе прадстаўлены вельмі сціпла. Акцэнт многіх цырыманіялаў на гераічным мінулым беларускага народа толькі перыяду Вялікай Айчыннай вайны відавочна звужае храналагічныя рамкі гістарычнай самаідэнтыфікацыі беларускай дзяржаўнасці сродкамі пратакола і тым самым скарачае магчымасці выкарыстання гісторыі ў патрыятычным выхаванні суайчыннікаў. Нацыянальная невыразнасць пратакола абумоўлена і абмежаванасцю выкарыстання беларускай мовы на афіцыйным узроўні, у дыпламатычнай перапісцы; як вынік — неадаптаванасць адпаведнай лексікі.

Калі разглядаць дзяржаўны пратакол не як дэкаратыўны прыдатак палітыкі, а як важны інструмент фарміравання іміджу краіны, неабходна, на наш погляд, насыціць сцэнарыі асноўных дзяржаўных мерапрыемстваў, усе складальныя пратакольнай практыкі нацыянальна-культурнай самабытнасцю, арыгінальнай сімволікай і атрыбутыкай, якія б адпавядалі агульнапрынятым сусветным стандартам і лепшым беларускім традыцыям.

Адным з крокаў у азначаным кірунку бачыцца, напрыклад, уключэнне ў праграмы афіцыйных візітаў на вышэйшым узроўні наведванне гасцямі спектакляў у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета ў суправаджэнні Прэзідэнта альбо Прэм'ер-міністра. Інтэр'ер тэатра пасля рэстаўрацыі цалкам ад-

павядае статусу такога мерапрыемства. Не менш цікавым магло б быць наведванне жонкамі высокіх гасцей гістарычных помнікаў у Міры, Навагрудку, Нясвіжы. Галоўнай ідэяй такіх наведванняў павінна стаць пераканаўчая дэманстрацыя старажытнасці вытокаў беларускай дзяржаўнасці, глыбокіх еўрапейскіх традыцый яе культуры.

Магчыма, наспеў час для стварэння спецыяльнага гістарычна-вайсковага палка (батальёна) у склад якога ўвайшлі бы падраздзяленні ў амуніцыі і са зброяй часоў Полацкага княства, ВКЛ, часцей Чырвонай Арміі Беларусі (1919—1922 гг.), Савецкай арміі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Удзел палка быў бы дарэчы на святочных парадах, магчыма — ў мерапрыемствах з нагоды візітаў высокіх замежных гасцей і інш. (Адпаведны, варты запазычання, вопыт дэманструюць нашы суседзі — пратакол Расійскай Федэрацыі.)

Новых падыходаў патрабуе таксама праца з замежнымі дыпламатамі, акрэдытаванымі ў Мінску. Сталай практыкай магло б стаць правядзенне прыёмаў ад імя Міністра культуры Рэспублікі Беларусь для аташэ па культуры, кіраўнікоў культурных цэнтраў (інстытутаў) замежных дзяржаў у Беларусі ў нацыянальных гісторыка-культурных цэнтрах рэспублікі — Каралеўскім замку ў Гродне, палацы Паскевічаў у Гомелі, Нясвіжскім і Мірскім замках; запрашэнне іх на рэспубліканскія фестывалі кіно і песні, мастацкія выставы, кірмашы выдавецкай прадукцыі, рыцарскія турніры, спартыўныя спаборніцтвы, прэм'еры ў нацыянальных тэатрах. Эфектыўнасць падобных мерапрыемстваў у прапагандзе дасягненняў айчыннай літаратуры, мызыкі, жывапісу, спорту, тэатра, кінематографу відавочная.

Удзельнікам міжнародных зносін яўна нестае яркай, самабытнай сувенірнай прадукцыі, праспектаў, фотаальбомаў, кніг па гісторыі і культуры Беларусі. Дзяржпратаколу неабходна стаць ініцыятарам вытворчасці такой прадукцыі і шырокага тыражавання пазітыўнага вобраза Беларусі ў зносіных з замежнымі партнёрамі з мэтай надання асобным яго рысам характара нацыянальных сімвалаў.

Нарэшце, карысна ў Асноўных палажэннях дзяржаўнай пратакольнай практыкі Беларусі дакладна вызначыць пералік пратакольных мерапрыемстваў, этыкетных сітуацый, у якіх няўхільным правілам павінна стаць выкарыстанне беларускай мовы. Без апошняга (будзем шчырымі) многія з вышэйпералічаных прапаноў губляюць сэнс.

## ПРОБЛЕМЫ ПАРЛАМЕНТСКОЙ ДИПЛОМАТИИ НА ПРИМЕРЕ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПАЛАТЫ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ НАЦИОНАЛЬНОГО СОБРАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

***Потапейко П. О.,*** *Институт экономики Национальной академии наук Беларуси*

Парламент — Национальное собрание Республики Беларусь является органом законодательной власти и представительным органом государства.

В арсенале работы парламента любой страны присутствует и дипломатия. В парламентской практике есть такие формы участия во внешней политике, как принятие деклараций и заявлений по международным проблемам, обращение к парламентам других стран, участие парламентских делегаций в работе межпарламентских организаций и международных форумов — например, Межпарламентского союза, который был создан в 1889 г. в Париже в целях поощрения личных контактов между парламентариями различных стран и их совместных усилий в деле сотрудничества между народами. Республика Беларусь вступила в Межпарламентский союз в 1995 г. Белорусские парламентарии также активно участвуют в Межпарламентской ассамблее государств — участников СНГ, созданной в 1992 г., и ряде других межпарламентских организаций.